# Краязнаўчае мерапрыемства
# “Куток дзівосны гнёздаў салаўіных”

**Мэта:**

1. Папулярызаваць краязнаўчыя веды, прыцягнуць больш вучняў да краязнаўства, падвесці вынікі краязнаўчых спраў за год.
2. Стварыць умовы для навучання прыёмам даследавання, сістэматызацыі, абагульнення інфармацыі, сабранай з розных крыніц, падчас падрыхтоўкі да свята.
3. Стварыць умовы для выхавання свядомых грамадзян Беларусі сродкамі краязнаўства.

**Форма падрыхтоўкі і правядзення:** калектыўная творчая справа.
**Месца правядзення свята:** актавая зала.
**Удзельнікі:** вучні 5-11 класаў.
**Абсталяванне:**

- плакаты “Куток дзівосны гнёздаў салаўіных – Капыльская радзімая зямля”, “Жыццё кароткае, Айчына вечная”,
- выстава “Мой экспанат для школьнага музея”,
- фотавыстава “Імгненні 2008 года”,
- тры дарожкі для гульні “Разумніцы і разумнікі” – чырвоная, жоўтая і зялёная, выраблены з каляровага картону ордэны для разумнікаў,
- прызы,
- прайгравальнік з дыскамі, каб перад мерапрыемствам і ў паўзах гучала прыгожая беларуская музыка – песні на музыку беларускіх кампазітараў.
-

## Падрыхтоўчы этап

Кожны клас атрымлівае заданне знайсці цікавую інфармацыю пра родны край, даследаваць пэўную з’яву і “прадставіць” вывучанае ў выглядзе альбома, газеты, малюнка, верша, танца, сцэнкі. На дошцы аб’яў змешчаны некаторыя пытанні краязнаўчага конкурса, прапанавана ўсім жадаючым прыняць удзел у конкурсе.

## Літаратура:


1. “Памяць. Капыльскі раён”. Мн., 2004.
2. А. Марціновіч “Ля Каменкі бруістай”, Мн., 2004.
3. Матэрыялы школьнага краязнаўчага музея і кабінета беларускай мовы і літаратуры.

# Пытанні краязнаўчага конкурса

1.Раскажы легенду пра паходжанне назвы“Капыль”.
2.Якія яшчэ населеныя пункты з коранем “кап” ёсць на Беларусі? Дзе?
3.Назаві і пакажы на карце археалагічныя помнікі нашай мясцовасці.
4.Калі і ў якім гістарычным дакуменце ўпершыню згадваюцца Капыль і Пясочнае?
5.“Куток дзівосны гнёздаў салаўіных, Капыльская радзімая зямля!”. Каму належаць гэтыя радкі?
6.Назаві поўныя назвы храмаў нашага краю.
7.Чаму і да цяперашняга часу значная частка насельніцтва Капыльшчыны называюць сябе западнікам?
8.Калі Песачанская  школа была 7-годкай? Калі стала 10-гадовай? 12-гадовай? 11-гадовай?
9.Калі быў пабудаваны наш школьны будынак?
10.Якія партызанскія брыгады дзейнічалі на Капыльшчыне?
11.Назаві імёны ветэранаў ВАВ в. Пясочнае.
12.Назавіце славутых людзей, што нарадзіліся ў Пясочным? У Лугавой?
13.Прачытай які-небудзь з вершаў А. Астрэйкі пра наш край.
14.Хто напісаў словы і музыку да песні “Бывайце здаровы”? Якія гісторыі вы ведаеце, звязаныя з гэтай песняй?
15.Прачытай верш ці праспявай песню на словы паэта-земляка А. Русака.
16.Назаві прозвішчы паэтаў, пісьменнікаў, мастакоў, што нарадзіліся на Капыльшчыне.
17.Праспявайце народную песню.
18.Правядзі з гледачамі і ўдзельнікамі гульню “Явар”, “Баяры”, “Цяцерку” ці інш.
19.Якія рэформы ты б правёў у Пясочным, калі б быў абраны старастам?
20.Які б бізнес ты распачаў у роднай вёсцы, каб гэта было выгадна для нашага мястэчка і для цябе?
21.Як змянілася Пясочнае за 50 гадоў? Як ты думаеш, як зменіцца яно праз 50 год?

# <u>Ход мерапрыемства</u>

1. Уступнае слова вядучага.

2. **Прадстаўленне журы** – у яго уваходзіць прадстаўнікі адміністрацыі школы, настаўнікі бел. мовы і літ., геаграфіі, гісторыя, загадчык краязнаўчага музея, бібліятэкар.

3. **Выстава-конкурс “Мой экспанат для школьнага музея”**

Кожная прынесеная рэч падпісаная, хто яе прынёс, дзе ўзяў, у чым яе навуковая каштоўнасць. Выставу прадстаўляе падрыхтаваны вучань-экскурсавод. Вызначаецца самы цікавы з экспанатаў, усе вучні – удзельнікі выставы атрымліваюць прыз – дыск з запісамі песень на словы А. Русака ў выкананні салістаў Нацыянальнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам М. Фінберга.

4. **Прадстаўленне фотавыставы “Імгненні 2008 года”.**

На працягу года ў школе было праведзена традыцыйнае свята народнага гумару “Смяяцца не грэх” праведзены конкурс “Мой радавод”, вучні-краязнаўцы ўдзельнічалі ў раённых навукова-практычных канферэнцыях, наведалі музей К. Чорнага, этнаграфічны музей у вёсцы Вялешына. Пра ўсё гэта трэба расказаць і паказаць. Для гэтага афармляецца фотавыстава, загадзя рыхтуюцца вучні - удзельнікі тых спраў, якія яны прадстаўляюць.

5. **Краязнаўчы конкурс** у форме гульні **“Разумнікі і разумніцы”.**

Перамагае той удзельнік, які раней дойдзе да фініша. На зялёнай дарожцы можна памыліцца 2 разы, а пытанняў будзе зададзена 4. На жоўтай дарожцы 3 крокі, а памыліцца можна толькі адзін раз. Чырвоная дарожка - самая кароткая да перамогі, але на ёй нельга памыліцца ніводнага разу. Мы праводзілі тры туры гульні, астатнія пытанні конкурсу былі зададзены гледачам. Каб разумнікі маглі выбраць дарожкі, ім былі прапанаваныя заданні.

*Заданне першай тройцы:* на працягу адной хвіліны сказаць прамову **“Пясочнае – лепшае месца ў свеце”.**

*Другая тройка* за гэткі ж час павінна была выказацца на тэму **“Ты – стараста Пясочнага. Якія рэформы б ты правёў у вёсцы, каб палепшыць жыццё людзей?”.**

“**Ты – паспяховы прадпрымальнік. Які б бізнес ты распачаў у роднай вёсцы,** каб гэта было выгадна для нашага мястэчка і для цябе?” - на гэтую тэму гаварылі удзельнікі *трэцяга тура.*
Гэтыя заданні ўдзельнікі ведалі загадзя.

**Дадатковыя пытанні:**

- У якім годзе ўпершыню ўпамінаецца вёска Пясочнае? *(12 лютага 1568 г.)*
- Адкуль пайшла назва вёскі Пясочнае? *(Залежы пяскоў)*
- Як называлася царква, што была ў Пясочным? *(Пакроўская царква)*
- Чыё імя носіць Песачанская СШ? Што вы ведаеце пра гэтага дзеяча? *(Умрэйка Сцяпан Андрэевіч, вучоны, прафесар ў галіне педагогікі)*
- У гонар якіх знакамітых людзей названы вуліцы Пясочнага? *(Я. Коласа, Я. Купалы, А. Пушкіна, А. Русака, В. Драздовіча, Кірава, Калініна)*
- У Пясочным быў свой ансамбль народных інструментаў. Як ён называўся? *(“Нёманцы”)*
- Хто з нашых слаўных землякоў пахаваны на могілках Пясочнага? *(Паэт А. Русак, Васіль Астрэйка – партызан, удзельнік Лаўскага бою)*
- Якому нашаму земляку належаць словы: “Я шчыра ганаруся тым, што родам з-пад Капыля? *(А. Астрэйку)*
- Якому нашаму земляку належаць словы: “Куток дзівосны гнёздаў салаўіных – Капыльская радзімая зямля”? *(М. Майсюку)*
- “Бывайце здаровы, жывіце багата...” Хто аўтар гэтых радкоў? *(А. Русак)*
- Назавіце кнігі, напісаныя А. Русаком. *(“Песні і вершы”, “Толькі з табою”, “Засцілайце сталы”, “У Буслаўцы”, “Добра ведаю ўрок” і др.)*
- Назавіце кнігі, напісаныя А. Астрэйкам. *(“Слуцкі пояс”, “Нёман”, “Прыгоды дзеда Міхеда”, “Цвіціце, верасы”, “Сэрца насцеж”, “Зямля мая” і др.)*
- Якіх мастакоў, ураджэнцаў Капыльшчыны, вы ведаеце? *(Алена Кіш, Уладзімір Пасюкевіч, Пётр Розін, Генадзь Галубовіч, Іван Пешкур)*

- Раней гэта вёска мела назву свойскай жывёлы, а цяпер абазначае “месца каля рэчкі, якое залівае вада”. Што гэта за вёска? *(Свінка, Лугавая)*
- Каму прысвечана памятная дошка, што прымацавана на магазіне ў вёсцы Лугавая? *(Васілю Сташэўскаму)*
- Назавіце знакамітых людзей вёскі Лугавая. *(Гурскі Антон Іванавіч – вучоны, мовазнаўца; Гурскі Канстанцін Іванавіч – мовазнаўца, Васіль Сташэўскі – пісьменнік)*
- Фальварак Хіначова, Атонава, Сінячова. А як сёння называецца гэта вёска? *(Калінаўка)*
- Які помнік прыроды знаходзіцца ў Сінячове? *(Старажытны парк)*
- Назавіце славуты бой, які адбыўся ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў нашым раёне, у якім прымалі ўдзел і песачанцы. *(Лаўскі бой)*
- 3 лютага 1943 года фашысцкім карніцкім батальёнам была спалена якая вёска ў нашым раёне? *(Рулёва)*
- Недалёка ад вёскі Пясочнае знаходзіцца запаветнае месца. Што гэта за месца? *(Заалагічны заказнік “Ракітнік”)*
- Ад якіх рэк пачынае бегчы Нёман? *(Уса і Лоша)*
- Куды ўпадае рака Нёман? *(У Балтыйскае мора)*
- Агульная даўжыня Нёмана. *(937 км.)*
- Назавіце самыя блізкія к Пясочнаму прытокі Нёмана. *(Баранаўка, Лоша, Тур’я, Уса)*
- Якія карысныя выкапні знаходзяцца каля вёскі Пясочнае? *Радовішча пяску і торфу)*

6. **Журы падводзіць вынікі, узнагароджвае пераможцаў, удзельнікаў конкурсаў.**

**Падвядзенне вынікаў.**

1. Абмеркаванне з тымі, хто рыхтаваў свята, што атрымалася, што не, чаму, што можна было б зрабіць іначай.
2. Прапанаваць вучням, схільным да творчасці, напісаць артыкул у газету пра свята.